## Да 60-годдзя факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый

нікам 2004 г. былі прысвоены такія новыя кваліфікацыі, як «бібліятэкар-бібліёграф, менеджэр», «бібліятэкар-бібліёграф, спецыяліст па АБІС», «бібліятэкар-бібліёграф, выкладчык», «бібліятэкар-бібліёграф, спецыяліст па інфармацыі», «бібліятэкар-бібліёграф, таваразнаўца». Сённяшняя задача факультэта – адкрыццё новых спецыяльнасцей для сферы інфармацыйна-дакументных камунікацый.

Першым ва універсітэце факультэт пачаў стварэнне ў Беларусі дзейснай шматузроўневай бесперапыннай сістэмы бібліятэчнай адукацыі: сярэдне-спецыяльная ўстанова – універсітэт – магістратура – аспірантура – дадатковая адукацыя (атрыманне другой спецыяльнасці, павышэнне кваліфікацыі, перападрыхтоўка). Для кожнага з узроўняў адукацыі сумеснымі намаганнямі ФІДК, Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума, Мінскага лінгва-гуманітарнага комплексу «гімназія – каледж» №24, а таксама факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў БДУ культуры распрацавана адпаведная нарматыўная і навукова-метадычная дакументацыя: стандарты, скразныя вучэбныя планы, праграмы вывучаемых дысцыплін, дапаможная літаратура. У 2000 г. упершыню быў зацверджаны Міністэрствам адукацыі і выдадзены дзяржаўны стандарт вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія», які распрацаваны выкладчыкамі факультэта. Усё гэта стала трывалай базай для пераходу факультэта на еўрапейскі стандарт адукацыі: бакалаўр – спецыяліст – магістр.

Пасля рэарганізацыі на факультэце функцыяніруе сем кафедраў. Чатыры з іх з'яўляюцца спецыяльнымі: кафедра тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый (заг. кафедры – докт. пед. навук, прафесар Лявончыкаў В.Е.), інфармацыйных рэсурсаў (докт. філал. навук, прафесар Марозаў А.У.), менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы (канд.пед.навук, дацэнт Зыгмантовіч С.В.), кафедра гісторыі Беларусі і музеязнаўства (докт. гіст. навук., прафесар Грыцкевіч А.П.). Дэканату ФІДК таксама падначалены кафедра беларускай філалогіі (заг. кафедры – канд. філал. навук, прафесар Гуліцкая В.А.), замежных моў (канд. філал. навук, дацэнт Падабедава Н.А.), якія па свайму статусу з'яўляюцца агульнауніверсітэцкімі, але рыхтуюць студэнтаў па адпаведных спецыялізацыях, а таксама кафедра сусветнай літаратуры (заг.кафедры – канд.філал.навук, дацэнт Булацкая Н.А.).

На кафедрах факультэта разам з іх загадчыкамі працуюць высокакваліфікаваныя выкладчыкі: дактары навук, прафесары М.А.Бяспалая, А.І.Смолік, кандыдаты навук, прафесары В.С.Варапаева, Л.А.Дзямешка, Н.А.Ляйко, Р.А.Ровіна, М.А.Яцэвіч, дацэнты В.М.Бігеза, С.У.Ільіна, В.А.Касап, Н.У.Клімянкова, С.А.Паўлава, А.У.Пісарэнка, Б.В.Пятрэнка, В.І.Саітава, Э.С.Суддзя і іншыя. У якасці сумяшчальнікаў ФІДК далучае да выкладання вядучых спецыялістаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: дырэктара, доктара педагагічных навук, Р.С.Матульскага, яго намесніка канд. пед. навук, дацэнта Т.В.Кузьмініч (выпускнікі факультэта) і іншых вядучых бібліятэк. Па свайму навуковаму статусу факультэт цвёрда трымае першае месца ва універсітэце. У апошнія пяць гадоў на факультэт прыйшлі працаваць маладыя выкладчыкі, выпускнікі аспірантуры універсітэта: канд.пед.навук А.М.Багарэвіч, ст. выкладчык Н.Я.Петушко, выкладчыкі Ю.Макушынская, Т.С.Юхнавец, якія ўжо абаранілі ці прадставілі да абароны кандыдацкія дысертацыі. Кіраўніцтва факультэта бачыць адной з асноўных задач сваёй дзейнасці павелічэнне колькасці маладых выкладчыкаў на кафедрах. Для гэтага актыўна выкарыстоўваецца магістратура і аспірантура. Ва універсітэце працуе Спецыялізаваны савет па абароне дысертацый на суісканне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 05.25.03 – «Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства».

Можна падоўжыць пералік дасягненняў факультэта, успомніць яго знакамітых выпускнікоў, адзначыць навуковыя дасягненні, трывалыя сувязі з бібліятэкамі і музеямі, сказаць пра тое, што выпускнікі ФІДК запатрабаваны і не маюць праблем з працаўладкаваннем, што набор на яго паступова павялічваецца, а ў 2004 г. стаў самым вялікім за апошнія дзесяць гадоў (135 бюджэтных месцаў) ...

Станоўчыя шматгадовыя вынікі развіцця ФІДК дазваляюць гаварыць аб паступовым устойлівым развіцці факультэта, пашырэнні сферы дзейнасці яго выпускнікоў, спадзявацца, што факультэт і надалей будзе адпавядаць высокім патрабаванням вядучай вышэйшай навучальнай установы культуры ў пачэснай справе падрыхтоўкі спецыялістаў для інфармацыйнага забеспячэння ўсіх галін дзейнасці ў краіне.

Шаноўныя студэнты, магістранты, аспіранты, выкладчыкі і выпускнікі нашага факультэта! Шчыра віншую вас з юбілеем. Жадаю творчага плёну, прафесійнага шчасця, асабістых поспехаў і ўдач!


Мікалай Яцэвіч

*Шаноўныя чытачы! У папярэднім нумары часопіса «Бібліятэчны свет» змешчана дастаткова вялікае інтэрв'ю са мной, у якім распавядаецца пра цяперашні стан і праблемы падрыхтоўкі кадраў на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУ культуры. Акрамя таго, у гэтым нумары часопіса таксама змешчаны матэрыялы, прысвечаныя факультэту і яго выкладчыкам. Шмат інфармацыі аб гісторыі факультэта вы можаце атрымаць у «Бібліятэчным свеце» (2000, № 2), калі факультэт святкаваў сваё 55-годдзе. Цяпер хочацца нагадаць толькі найбольш значныя гістарычныя вехі ў развіцці факультэта і павіншаваць усіх тых, хто мае да яго непасрэднае дачыненне: студэнтаў, выкладчыкаў, выпускнікоў.*

# Факультэту інфармацыйна-дакументных камунікацый – 60

## Гістарычныя вехі развіцця факультэта:

• **29 ліпеня 1944 г.** – Пастанова СНК БССР аб стварэнні бібліятэчнага факультэта ў складзе Мінскага педагагічнага інстытута.

• **Кастрычнік 1944 г.** – пачатак заняткаў на факультэце з першымі 30-цю студэнтамі. Адкрыццё кафедры бібліятэказнаўства.

• **Канец 50-х гг.** – на факультэце навучаецца звыш 200 студэнтаў.

• **1950 – 1960 гг.** – адкрыццё вячэрняга, завочнага аддзяленняў і экстэрнату.

• **1960 г.** – стварэнне кафедры бібліяграфіі.

• **60-я гг.** – пераход да падрыхтоўкі спецыялістаў па тыпах бібліятэк: «Масавыя і навуковыя бібліятэкі», «Дзіцячыя і школьныя бібліятэкі», «Тэхнічныя бібліятэкі».

• **1969 – 1970 гг.** – адкрыццё на факультэце аддзялення культасветработы па спецыялізацыі «харавое дырыжыраванне».

• **1975 г.** – адкрыццё на базе факультэта бібліятэказнаўства і бібліяграфіі Мінскага інстытута культуры. Стварэнне кафедры тэхнічнай літаратуры і інфарматыкі.

• **1978 г.** – стварэнне кафедры дзіцячай літаратуры і бібліятэчнай работы з дзецьмі.

• **1983 г.** – пераход на новы тыпавы вучэбны план і фарміраванне спецыялізацый па галіновых комплексах літаратуры: «бібліятэказнаўства і бібліяграфія грамадска-палітычнай літаратуры», «бібліятэказнаўства і бібліяграфія мастацкай літаратуры», «бібліятэказнаўства і бібліяграфія тэхнічнай літаратуры», «бібліятэказнаўства і бібліяграфія сельскагаспадарчай літаратуры», «бібліятэказнаўства і бібліяграфія дзіцячай літаратуры і літаратуры для юнацтва».

• **1983 г.** – распачата падрыхтоўка кадраў па спецыялізацыі «Методыка выкарыстання сродкаў механізацыі і аўтаматызацыі ў бібліятэчнай справе».

• **Другая палова 80-х гг.** – стварэнне кафедры фондаў і каталогаў, кафедры галіновых бібліяграфій і дакументазнаўства, кафедры інфарматыкі і тэхнічных сродкаў.

• **Канец 80-х гг.** – 70 працэнтаў выкладчыкаў факультэта маюць вучоныя ступені і званні.

• **80-я гг.** – толькі на дзённую форму навучання на факультэт штогод прымаецца каля 200 студэнтаў з Беларусі. На факультэце навучаецца каля 80-ці замежных студэнтаў.

• **Пачатак 90-х гг.** – рэзкае зніжэнне набору студэнтаў на факультэт і аб'яднанне кафедраў.

• **1993 – 2003 гг.** – па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» на факультэце працуюць тры спецыяльныя кафедры: бібліятэказнаўства, бібліяграфіі і дакументазнаўства, аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм.

• **1993 г.** – пераўтварэнне Мінскага інстытута культуры ў Беларускі універсітэт культуры. Змена назвы факультэта на «Факультэт бібліятэчна-інфармацыйных сістэм».

Пераход на пяцігадовы універсітэцкі ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў. Распрацоўка новага вучэбнага плана. Адкрыццё аспірантуры па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія».

• **1994 г.** – стварэнне кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства і ажыццяўленне набору на спецыяльнасць «музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры».

• **1994 – 1995 гг.** – распачата рэалізацыя праграмы шматузроўневай падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй на базе Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума і Мінскага лінгва-гуманітарнага комплексу «гімназія – каледж» № 24 з 3-х гадовым тэрмінам навучання ва універсітэце. Адкрыццё бакалаўрыяту і магістратуры.

• **1996 г.** – адкрыццё здвоенай спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія, беларуская мова і літаратура».

• **1999 г.** – адкрыццё аспірантуры па спецыяльнасці «музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры».

• **1998 – 1999 гг.** – распрацоўка і выданне першага дзяржаўнага адукацыйнага стандарта па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія».

• **2000 – 2001 гг.** – распрацоўка і зацвярджэнне ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам новага базавага вучэбнага плана па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія».

• **2002 г.** – уключэнне ў «Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь. Спецыяльнасці і кваліфікацыі» трох спецыяльнасцей факультэта і 16-ці спецыялізацый, а таксама напрамкаў спецыяльнасцей і здвоеных кваліфікацый. Аднясенне ў класіфікатары спецыяльнасцей факультэта ў напрамак «інфармацыя і камунікацыя».

• **Красавік 2003 г.** – рэарганізацыя факультэта ў факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый з кафедрамі: тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый, інфармацыйных рэсурсаў, менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, гісторыі Беларусі і музеязнаўства, беларускай філалогіі, замежных моў, сусветнай літаратуры.

• **2003 г.** – прывядзенне зместу работы кафедраў да новай структуры факультэта. Ажыццяўленне спецнабору студэнтаў для Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

• **Кастрычнік 2004 г.** – 60-годдзе факультэта.

### Шаноўныя студэнты факультэта!

Прыміце самыя шчырыя віншаванні з нагоды 60-годдзя факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый. Мы, выкладчыкі, працуем выключна для вас. Паважаем вас, лічым сваімі малодшымі сябрамі, заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу. Імкнёмся пастаянна ўдасканальваць вучэбныя планы і праграмы, прыводзіць іх у адпаведнасць да патрабаванняў сучаснай бібліятэчна-інфармацыйнай і музейнай практыкі, якая характарызуецца актыўным укараненнем інфармацыйных тэхналогій, пераўтварэннем бібліятэк і музеяў у шматфункцыянальныя сацыяльныя інстытуты па інфармацыйнаму забеспячэнню розных сфер дзейнасці, павышэнню адукаванасці, арганізацыі вольнага часу і

выхавання жыхароў краіны. Сёння любы выпускнік пры жаданні, настойлівай працы і наяўнасці творчых здольнасцей можа прайсці на факультэце ўсе ступені бесперапыннай адукацыі: магістратуру, аспірантуру, дактарантуру, павышэнне кваліфікацыі. Шмат намаганняў робіцца факультэтам па арганізацыі выхаваўчага працэсу і вашага вольнага часу. За апошнія гады праведзена мноства цікавых мерапрыемстваў, у якіх бралі актыўны ўдзел студэнты практычна ўсіх груп.

Ад імя прафесарска-выкладчыцкага складу факультэта жадаю вам творчага натхнення ў авалоданні ведамі, уменнямі і навыкамі па сваіх спецыяльнасцях, удачы на экзаменах і заліках, актыўнага ўдзелу ў жыцці факультэта і універсітэта, студэнцкай весялосці і асабістага шчасця.

### Шаноўныя выкладчыкі факультэта!

Маю гонар працаваць разам з вамі на нашым факультэце, з многімі – вось ужо на працягу чвэрці стагоддзя. Удзячны за карыснае і плённае супрацоўніцтва па ўсіх накірунках дзейнасці. Нам удалося дасягнуць самага важнага – стабільнасці і высокага ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў. Мы можам ганарыцца створанай сістэмай шматузроўневай бесперапыннай бібліятэчнай адукацыі, запатрабаванасцю нашых выпускнікоў у бібліятэках, інфармацыйных службах і музеях, навуковымі і метадычнымі дасягненнямі. Хочацца ўспомніць тых, хто плённа працаваў на карысць факультэта, але каго, на жаль, ужо няма разам з намі: першага дэкана факультэта І.Б.Сіманоўскага, дэканаў В.П.Іванову, Н.М.Калоска, К.С.Верабея, А.Ф. Галуза, В.А.Фаміна, загадчыкаў кафедрамі, дацэнтаў М.Ц.Талкачова, М.В.Іванова, В.Ф. Якіменка, дацэнтаў А.І. Усціменка, І.К.Бураўкіна, старшых выкладчыкаў Г.Г.Ракееву, Г.І.Ціханаву. Сённяшні прафесарска-выкладчыцкі склад факультэта з годнасцю прадаўжае і развівае ўсё тое, што было напрацавана імі. Са спадзяваннем глядзім мы на маладых выкладчыкаў, чакаем ад іх цікавых прапаноў і новых падыходаў па ўдасканаленні падрыхтоўкі кадраў, павелічэнні колькасці спецыяльнасцей і спецыялізацый факультэта.

Шаноўныя калегі, прыміце самыя шчырыя віншаванні з нагоды юбілею нашага факультэта. Жадаю вам новых прафесійных здзяйсненняў, моцнага здароўя, асабістага шчасця. Хочацца верыць, што факультэт будзе існаваць столькі, колькі будуць існаваць бібліятэкі, музеі, інфармацыйныя службы і іншыя сацыяльныя інстытуты сферы інфармацыйна-дакументных камунікацый.

### Шаноўныя выпускнікі факультэта!

Бадай няма ніводнай бібліятэкі ў Беларусі, дзе б ні працавалі выпускнікі факультэта. Яны працуюць звычайнымі бібліятэкарамі і бібліёграфамі, кіраўнікамі структурных падраздзяленняў бібліятэк, інфармацыйных цэнтраў, іх дырэктарамі; з'яўляюцца вядомымі ў Беларусі і за яе межамі навукоўцамі і выкладчыкамі, пісьменнікамі і паэтамі, дзяржаўнымі і грамадскімі дзеячамі і нават міністрамі. Шэраг выпускнікоў факультэта працуюць не толькі ў бібліятэках, але і ў іншых самых розных сферах дзейнасці і дзякуючы трывалай базавай падрыхтоўцы таксама дасягнулі там значных поспехаў. Факультэт плённа супрацоўнічае практычна з усімі буйнейшымі бібліятэкамі Беларусі. Мы ўдзячны вам за магчымасць правядзення вучэбных і вытворчых практык, азнаямляльных і лабараторных заняткаў, за актыўнае навукова-метадычнае і грамадскае ўзаемадзеянне. Са свайго боку заўсёды гатовы даць вам магчымасць навучацца ў нашай магістратуры і аспірантуры, павышаць сваю кваліфікацыю. На жаль, факультэт не можа пакуль поўнасцю задаволіць усе патрэбы ў бібліятэчных кадрах краіны. Разам з тым, набор студэнтаў (бюджэтная форма навучання) павялічыўся за апошнія 10 гадоў у два разы: з 63 чалавек у 1994 г. да 125 чалавек у 2004 г.

Ведаю, што юбілей факультэта – гэта і ваша свята, таму ад імя прафесарска-выкладчыцкага складу факультэта шчыра віншую вас з гэтай знамянальнай падзеяй. Зычым вам прафесійных поспехаў, спадзяёмся на далейшае плённае супрацоўніцтва.

# Кафедры як асноўныя структурныя падраздзяленні ФІДК



Святлана Зыгмантовіч

## КАФЕДРА МЕНЕДЖМЕНТУ ІНФАРМАЦЫЙНА-ДАКУМЕНТНАЙ СФЕРЫ

Кафедра менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы (былая кафедра бібліятэказнаўства) узнікла адначасова з нараджэннем бібліятэчнага факультэта ў кастрычніку 1944 г. пры Мінскім педагагічным інстытуце і з'явілася заснавальніцай вышэйшай бібліятэчнай адукацыі ў Беларусі.

У гістарычным аспекце можна вызначыць асноўныя вехі развіцця кафедры:

– арганізацыя і першапачатковае станаўленне, звязанае з развіццём бібліятэчнай справы і адукацыі ў краіне (1944 – 1960 гг.);

– паступовае развіццё, вызначанае пашырэннем складу штатных выкладчыкаў і вылучэннем кафедры бібліяграфіі (1961 – 1974 гг.);

**Да 60-годдзя факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый**

– новы статус кафедры ў сувязі з адкрыццём Мінскага інстытута культуры, перайменаванага потым у Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры, фарміраванне асноўнага складу выкладчыкаў-навукоўцаў (1975 – 2003 гг.);

– перайменаванне кафедры бібліятэказнаўства ў кафедру менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ў сувязі з рэарганізацыяй факультэта, адкрыццём новых спецыяльнасцей (з 2003 года).

На кожным з гэтых этапаў адзначаліся пэўныя дасягненні, адкрываліся новыя перспектывы і вырашаліся новыя праблемы. У новае дзесяцігоддзе кафедра ўвайшла ў складзе 10 штатных выкладчыкаў, у іх ліку 1 прафесар, 7 дацэнтаў, 1 старшы выкладчык і 1 выкладчык. Загадвае кафедрай кандыдат педагагічных навук дацэнт Святлана Вікенцьеўна Зыгмантовіч.

За гісторыю свайго існавання кафедра здзейсніла 6 комплексных навуковых даследаванняў; апублікавала звыш 40 буйных навуковых прац-манаграфій, вучэбных дапаможнікаў, падручнікаў, сотні артыкулаў; прыняла ўдзел у мностве міжнародных канферэнцый, сімпозіумаў; падрыхтавала навукоўцаў – кандыдатаў навук; трымае цесную сувязь з бібліятэкамі РБ.

На сучасны момант кафедра ажыццяўляе падрыхтоўку бібліятэчных спецыялістаў па спецыялізацыях: бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей і юнацтва; маркетынг бібліятэчнай справы; кнігазнаўства і менеджмент кніжнага гандлю.

Узяты старт новага этапа ў развіцці: кафедра прыступае да распрацоўкі двухступенчатай сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай адукацыі: бакалаўрыят-магістратура; плануе распачаць падрыхтоўку кадраў па здвоеных спецыяльнасцях: бібліятэкар-бібліёграф, выкладчык спецыяльных дысцыплін; бібліятэкар-бібліёграф, арганізатар сацыякультурнай дзейнасці; бібліятэкар-бібліёграф, псіхолаг; бібліятэкар-бібліёграф, менеджэр кніжнага гандлю; завяршае комплексную навукова-даследчую тэму; кіруе дысертацыйнымі даследаваннямі аспірантаў і суіскальнікаў.

Выкладчыкі кафедры аднаўляюць змест і структуру вучэбных праграм, распрацоўваюць падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, метадычныя матэрыялы; укараняюць інавацыйныя камп'ютэрныя і сацыяльныя тэхналогіі, накіраваныя на павышэнне пазнавальнай актыўнасці і самастойнасці студэнтаў; удасканальваюць сістэму кантролю і ацэнкі ведаў і ўменняў студэнтаў, бакалаўраў, магістрантаў.

**Васіль Лявончыкаў**

## КАФЕДРА ТЭОРЫІ І ГІСТОРЫІ ІНФАРМАЦЫЙНА-ДАКУМЕНТНЫХ КАМУНІКАЦЫЙ

Кафедра была створана ў 1960 г. На працягу часу свайго існавання назва яе неаднаразова змянялася (кафедра бібліяграфіі, кафедра агульнай бібліяграфіі, кафедра бібліяграфіі і дакументазнаўства). 3 мая 2003 г., пасля структурных зменаў на факультэце, яна атрымала прыведзеную вышэй назву. Але змянілася не толькі назва, змяніўся ў значнай ступені пералік вучэбных дысцыплін, выкладанне якіх яна павінна забяспечваць. Зараз на кафедры знаходзяцца наступныя агульнапрафесійныя дысцыпліны па спецыяльнасці «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія»: сацыяльныя камунікацыі, дакументазнаўства і кнігазнаўства, бібліятэказнаўства: тэорыя і гісторыя, бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства. Акрамя таго, да кафедры прымацаваны спецыялізацыі «бібліятэказнаўства і бібліяграфія, краязнаўства» і «бібліятэказнаўства і бібліяграфія, замежная мова». На першай з іх усе вучэбныя дысцыпліны (бібліятэказнаўчыя, бібліяграфічныя, інфармацыйныя) выкладаюцца супрацоўнікамі кафедры. На другой – толькі адзін вучэбны курс (замежныя базы даных), астатнія (замежная мова) забяспечвае навучанне кафедра замежных моў.

Кафедра ўдзельнічае ў распрацоўцы навуковай тэмы «Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк Рэспублікі Беларусь і іх кадравы патэнцыял». Загадчык кафедры прафесар В.Е. Лявончыкаў вывучае тэарэтычныя асновы інфармацыйных рэсурсаў; дацэнт В.А. Касап – рэсурсы ў галіне патэнтнай інфармацыі; дацэнт Т.В. Кузьмініч – інфармацыйна-бібліяграфічныя рэсурсы па гісторыі Беларусі і гістарычных дысцыплінах; дацэнт В.І. Саітава – краязнаўчыя інфармацыйна-бібліяграфічныя рэсурсы; дацэнт А.І. Саломка ў межах тэмы складае слоўнік тэрмінаў па выдавецкай справе; выкладчык В.В. Бушуева на працягу некалькі год даследуе інфармацыйныя рэсурсы беларускага замежжа; І.М. Стрыжонак вывучае інфармацыйныя рэсурсы абласных універсальных навуковых бібліятэк, іх стварэнне і выкарыстанне.

Кафедра ў 2003 г. шмат зрабіла па складанню тыпавых праграм па асноўных тэарэтычных і гістарычных дысцыплінах. Гэтую працу мы будзем працягваць і далей. Другі накірунак – стварэнне вучэбных дапаможнікаў па спецыяльных дысцыплінах. Т.В. Кузьмініч напісала і выдала ўпершыню вучэбны дапаможнік па «Інфармацыйнай культуры асобы». В.І. Саітава падрыхтавала вучэбны дапаможнік па «Гісторыі сусветнай бібліяграфіі», В.А. Касап – па «Інфармацыйна-патэнтнай дзейнасці». В.Е. Лявончыкаў у сааўтарстве з Л.А. Дзямешкай і Р.І. Саматыя выдалі «Тлумачальны слоўнік», які ў 2002 г. заняў першае месца ў конкурсе на лепшую працу па бібліятэказнаўству, што праводзіць Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. У 2003 г. у выдавецтве «Вышэйшая школа» выйшла перапрацаванае і дапоўненае выданне гэтага слоўніка, якое было аднесена да сацыяльна значных выданняў і распаўсюджана па бібліятэках Беларусі. Зробленае – толькі пачатак. Наперадзе шмат працы па ўсіх напрамках дзейнасці кафедры.



Аляксандр Марозаў

# КАФЕДРА ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ

Кафедра інфармацыйных рэсурсаў была створана ў красавіку 2003 г. адпаведна загаду рэктара БДУ культуры № 42 ад 1 красавіка 2003 г. «Аб упарадкаванні структуры універсітэта». Згодна з новым загадам рэктара ад 12 мая 2003 г. «Аб змяненні структуры факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм» быў вызначаны прафесарска-выкладчыцкі склад кафедры, пералік спецыялізацый і вучэбных дысцыплін, якія яна забяспечвае.

Місія кафедры заключаецца ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне фарміравання, стварэння і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў (ІР) на базе сучасных аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм і інтэрнет-тэхналогій.

Такі падыход дазволіў сабраць на адной кафедры ўсе «інфармацыйна-рэсурсныя» дысцыпліны (бібліятэчныя фонды, каталагізацыю дакументаў, інфармацыйнае забеспячэнне галіновых комплексаў, аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы і іншыя) і паставіць мэтай выкладаць разам як традыцыйную, так і аўтаматызаваную тэхналогію фарміравання, стварэння і выкарыстання ІР.

Менавіта таму ў складзе новай кафедры былі аб'яднаны ўсе выкладчыкі профільных ёй дысцыплін, якія раней працавалі на былых кафедрах бібліятэказнаўства, агульнай бібліяграфіі і дакументазнаўства, аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм.

Першапачаткова абавязкі загадчыка кафедры інфармацыйных рэсурсаў часова былі ўскладзены на дэкана ФІДК Яцэвіча М.А. У лютым 2004 г. загадчыкам гэтай кафедры быў прызначаны былы выпускнік факультэта «бібліятэказнаўства і бібліяграфіі» Мінскага інстытута культуры, доктар філалагічных навук, прафесар Марозаў А.У.

Па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» кафедра ІР забяспечвае выкладанне агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплін, а таксама дысцыплін спецыялізацый. Сярод агульнапрафесійных дысцыплін: «Аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы і сеткі», «Тэхнічныя сродкі бібліятэчнай работы», «Матэматычныя метады бібліятэчнай работы». Спецыяльныя дысцыпліны: «Бібліятэчныя фонды», «Каталагізацыя дакументаў», «Інфармацыйнае забеспячэнне галіновых комплексаў (навукова-тэхнічнага і медыцынскага, сацыяльна-гуманітарнага, літаратуразнаўчага і эстэтычнага)».

Кафедра навучае студэнтаў пакуль па дзвюх спецыялізацыях: «Аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы» («АБІС») і «Інфармацыйнае забеспячэнне навукова-тэхнічнага і медыцынскага комплексу». У рамках спецыялізацыі «АБІС» таксама існуе спецгрупа для Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. За кафедрай замацаваны і шэраг іншых спецыялізацый, набор студэнтаў на якія пакуль не ажыццяўляецца.

Выпускнікі спецыялізацыі «АБІС» прызначаны для арганізацыйна-тэхналагічнай дзейнасці па праектаванні, стварэнні, эксплуатацыі і падтрымцы аўтаматызаваных бібліятэчных сістэм. Аб'ектам іх прафесійнай дзейнасці з'яўляюцца бібліятэкі розных тыпаў і відаў, у якіх ужо існуюць ці толькі ўкараняюцца аўтаматызаваныя сістэмы. Студэнты вывучаюць наступныя дысцыпліны спецыялізацыі: «Архітэктура і ўстройства ПЭВМ», «Праграмнае забеспячэнне АБІС», «Алгарытмізацыя і праграмаванне бібліятэчна-інфармацыйных задач», «Аўтаматызацыя апрацоўкі тэкставай інфармацыі», «Лінгвістычнае забеспячэнне АБІС», «Інфармацыйнае забеспячэнне АБІС», «Бібліятэчна-інфармацыйныя камп'ютэрныя сеткі», «Практыкум па стварэнні web-сайтаў» і іншыя.

Выпускнікі спецыялізацыі «Інфармацыйнае забеспячэнне навукова-тэхнічнага і медыцынскага комплексу» павінны ажыццяўляць арганізацыйна-тэхналагічную дзейнасць па стварэнні і выкарыстанні інфармацыйных прадуктаў і паслуг у навукова-тэхнічнай сферы і медыцыне. Яны прызначаны для работы, у першую чаргу, у спецыяльных бібліятэках: навукова-тэхнічных, медыцынскіх і адпаведных службах навуковай інфармацыі. Студэнты вывучаюць наступныя дысцыпліны спецыялізацыі: «Сістэмы інфармацыі на прадпрыемстве», «Патэнтна-інфармацыйная дзейнасць», «Індэксаванне навукова-тэхнічнай літаратуры».

На кафедры таксама навучаюцца аспіранты, суіскальнікі і магістры.

У БДУ культуры кафедра ІР забяспечвае выкладанне шэрага дысцыплін на спецыялізацыях «Менеджмент сацыяльна-культурнай сферы», «Інфармацыйныя сістэмы ў культуры» і «Літаратурная работа» факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці і факультэта традыцыйнай і сучаснай беларускай культуры.

З 2005 г. кафедра плануе пачаць набор па спецыяльнасці «Інфармацыя і камунікацыя» са спецыялізацыяй «Менеджмент інфармацыйных рэсурсаў», кваліфікацыя – «Спецыяліст па інфармацыі і камунікацыі. Менеджэр інфармацыйных рэсурсаў».

Выкладчыкі кафедры працуюць над навуковай тэмай «Электронныя інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк: фарміраванне, стварэнне і выкарыстанне».

Вольга Гуліцкая

# КАФЕДРА БЕЛАРУСКАЙ ФІЛАЛОГІІ

Кафедра беларускай філалогіі (першапачаткова кафедра літаратуры, пазней – кафедра беларускай мовы і літаратуры), створаная ў 1975 г., – важнае і неад'емнае навуковае, вучэбна-метадычнае і выхаваўчае падраздзяленне ў структуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры са стабільным высока-прафесійным навуковым і педагагічным калектывам, дзе арганічна спалучаюцца вопыт і творчыя здабыткі старэйшых супрацоўнікаў і свежыя таленты маладых і перспектыўных кадраў, дзякуючы чаму кафедрай вядзецца падрыхтоўка кваліфікаваных бібліятэкараў-педагогаў, якія пасля заканчэння універсітэта маюць запіс у дыпломе «Бібліятэкар-бібліёграф, выкладчык беларускай мовы і літаратуры». Такія спецыялісты, засвоіўшы сацыяльна-гуманітарныя вучэбныя курсы,



авалодаўшы спецыяльнымі дысцыплінамі філалагічнага (такімі, як сучасная літаратурная беларуская мова, культура мовы, стылістыка беларускай мовы, гісторыя і тэорыя беларускай літаратуры, сучасная беларуская літаратура, методыка выкладання беларускай мовы і літаратуры, агульнае мовазнаўства і інш.) і бібліятэчнага цыклаў, з поспехам працуюць як у сферы культуры, так і адукацыі.

Грунтоўную кваліфікаваную падрыхтоўку па філалогіі здзяйсняюць супрацоўнікі кафедры, якія настой-ліва, мэтанакіравана займаюцца навуковай працай, актывізацыі якой садзейнічае актуальная кафедральная тэматыка НДР, цесна звязаная з надзённымі праблемамі фундаментальных навук і практычнымі задачамі вучэбнага працэсу. У выніку выкладчыкі кафедры апублікавалі нямала навуковых прац-манаграфій, вучэбных дапаможнікаў, падручнікаў для агульнаадукацыйных школ, сотні артыкулаў, розных рэцэнзій, вучэбных праграм, прынялі ўдзел у шматлікіх міжнародных, рэспубліканскіх, універсітэцкіх навуковых канферэнцыях.

Кафедра беларускай філалогіі сёння – гэта кансультатыўны цэнтр для студэнтаў універсітэта, магістрантаў, аспірантаў, супрацоўнікаў:

– па методыцы выкладання гуманітарных дысцыплін;

– па праблемах літаратурнага жыцця краіны;

– па пытаннях культуры мовы і беларускамоўнага справаводства.

**Анатоль Грыцкевіч**

## КАФЕДРА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ І МУЗЕЯЗНАЎСТВА

Кафедра гісторыі Беларусі і музеязнаўства забяспечвае падрыхтоўку кадраў па спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны».

Кафедра адносна маладая ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры, паколькі спецыялістаў па музея-знаўству пачалі рыхтаваць толькі ў 1994 – 1995 акадэмічным годзе. Аднак за кароткі тэрмін было падрыхтавана пяць выпускаў спецыялістаў кваліфікацыі «музеявед».

Нашы выпускнікі працуюць у якасці інспектараў у галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, займаюцца рознымі пытаннямі, звязанымі з дзейнасцю музеяў рэспублікі, займаюць і кіруючыя пасады ў галіне культуры.

На кафедры працуюць 12 выкладчыкаў, у тым ліку 3 прафесары і 6 дацэнтаў.

Кафедра забяспечвае выкладанне на ўсіх факультэтах універсітэта агульнагістарычных і спецыяльных дысцыплін для студэнтаў спецыялізацыі «Музеязнаўства» такіх, як старажытныя музеі, музеі свету, музеі Беларусі, музейная архітэктура, музейная педагогіка, асновы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў, археалогія, геральдыка, нумізматыка, сфрагістыка, фалерыстыка, праектаванне выстаў і музейных экспазіцый і яшчэ каля двух дзесяткаў прадметаў.

Апрача таго, выкладчыкі кафедры распрацавалі шэраг курсаў, якія прапануюцца студэнтам іншых спецыялізацый на выбар: гістарычная сімволіка, гісторыя канфесій у Беларусі, генеалогія, сярэдневяковая кераміка, гісторыя філатэліі, жыллё ў звычаях і абрадах беларусаў і інш.

Выкладчыкі кафедры пастаянна прымаюць удзел у навуковых, навукова-метадычных і навукова-практычных канферэнцыях, якія праводзяцца як у межах рэспублікі, так і ў іншых дзяржавах.

Навуковыя артыкулы прафесараў кафедры А.П.- Грыцкевіча, М.А. Бяспалай, А.І. Смоліка, дацэнтаў І.Н. Колабавай, А.М. Нароўскай, А.А. Трусава друкуюць вядомыя беларускія выданні і рэспубліканскія часопісы. Толькі ў 2003 г. выкладчыкамі кафедры было апублікавана 80 артыкулаў.

З 2001 г. выкладчыкі кафедры пачалі распрацоўваць новую тэму «Гісторыя духоўнай і матэрыяльнай культуры», якая выконваецца кафедрай у межах навуковага накірунку «Гісторыя і тэндэнцыі развіцця духоўнай культуры Рэспублікі Беларусь».

**Наталля Падабедава**

## КАФЕДРА ЗАМЕЖНЫХ МОЎ

Кафедра замежных моў існуе з першага дня стварэння Мінскага інстытута культуры ў 1975 г. Кафедра забяспечвае выкладанне англійскай, нямецкай, французскай і іспанскай моў на ўсіх факультэтах універсітэта, а таксама ў групах аспі-рантаў і суіскальнікаў. У якасці спецдысцыпліны замежная мова выкладаецца ў асобай групе факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый. Дзейнасць кафедры як структурнай адзінкі ВНУ рэгламентуе ўся неабходная дакументацыя.

Штат кафедры прадстаўляюць 16 выкладчыкаў: 1 прафесар, 2 дацэнты, 5 ст. выкладчыкаў, 8 выкладчыкаў. 7 з іх працуюць на кафедры з першых дзён яе існавання: кандыдат філалагічных навук, прафесар Бранавіцкі Б.І., кандыдат філалагічных навук, дацэнт Падабедава Н.А., дацэнт Харытончык Г.А., ст. выкладчыкі: Баравік В.І., Жмуроўская Л.Д., Волкава А.С., Сілакова Т.А.

З 1975 г. па 1993 г. выкладчыкі кафедры замежных моў працавалі пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры, кандыдата філалагічных навук, дацэнта (з 1990 г. – прафесара) Бранавіцкага Б.І.; з 1993 г. па 1998 г. – кандыдата педагагічных навук, дацэнта Грыцкевіч Н.П., з 1998 г. па сённяшні час кафедра працуе пад кіраўніцтвам заг. кафедры кандыдата філалагічных навук, дацэнта Падабедавай Н.А.

Уся арганізацыйная і вучэбна-метадычная работа кафедры падпарадкавана асноўнай мэце навучання замежнай мове ў ВНУ, якая накіравана на дасягненне студэнтамі практычнага валодання моваи, яе выкарыстання ў прафесійнай дзейнасці і рэальным жыцці. Галоўны акцэнт у выкладанні замежнай мовы на кафедры робіцца на камунікатыўным аспекце валодання моваи, інтэнсіўным выкарыстанні матэрыялаў па профілю нашай ВНУ, а таксама пашырэнні ведаў студэнтаў па краіна-знаўству і культуры краін вывучаемай мовы, магчымасці прадстаўлення шырокага доступу да крыніц сусветнай навуковай інфармацыі. Кафедра разглядае замежную мову як абавязковы кампанент прафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, чым і абумоўлена прафесійная накіраванасць яе вывучэння ва універсітэце культуры.

Навукова-даследчая работа выкладчыкаў кафедры праводзілася ў розны час па наступных накірунках: «Прыкладная лінгвістыка», «Вывучэнне моўных сістэм» (кіраўнік – прафесар Бранавіцкі Б.І.), «Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці студэнтаў», «Інтэнсіфікацыя працэсу вывучэння замежных моў» (кіраўнік – дацэнт Грыцкевіч Н.П.), «Мова ў сферы культуры. Семантыка-сінтаксічная характарыстыка прафесійна-арыентаваных тэкстаў», «Праблемы методыкі выкладання замежных моў» (кіраўнік – дацэнт Падабедава Н.А.). Па выніках навуковых даследаванняў друкуюцца публікацыі выкладчыкаў кафедры – навуковыя артыкулы, вучэбныя дапаможнікі. За перыяд з 1996 па 2003 г. іх надрукавана 37, сярод іх 4 вучэбныя дапаможнікі па кожнай вывучаемай мове. Спецыялізацыяй і тэмамі навуковых даследаванняў выкладчыкаў кафедры абумоўліваецца тэматыка навукова-даследчых работ студэнтаў. За той жа перыяд пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры студэнтамі было зроблена на навукова-творчых канферэнцыях 65 дакладаў па рознай тэматыцы (лінгвістычнай, культуралагічнай, літаратуразнаўчай, краіназнаўчай).

Кафедра рыхтуе адпаведныя метадычныя матэрыялы, распрацоўкі, сістэматычна аднаўляе фонд вучэбнай літаратуры ў цеснай сувязі з бібліятэкай універсітэта і адпаведнымі службамі пасольстваў замежных краін.

Выкладчыкі кафедры маюць цесныя кантакты з выкладчыкамі кафедр замежных моў і іншых ВНУ, прымаюць удзел у Міжнародных навуковых канферэнцыях і мерапрыемствах, якія праходзяць у гэтых ВНУ, а таксама мерапрыемствах замежных інфармацыйных цэнтраў.



# Сустрэча з цікавым чалавекам

інтэрв'ю з прафесарам БДУ культуры Р.А.Ровінай

**– Чым з'яўляецца для Вас праца на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый?**

– Для мяне гэта ўсё жыццё. З факультэтам звязана 35 гадоў маёй прафесійнай дзейнасці. Я працавала выкладчыкам, загадчыкам кафедры тэхнічнай літаратуры і інфарматыкі. 10 год была дэканам факультэта бібліятэказнаўства і бібліяграфіі. Зараз узначальваю вучэбную частку універсітэта і працягваю выкладаць на факультэце.

**– Як Вы прыйшлі ў бібліятэчную прафесію?**

– Выпадкова. Збіралася стаць гісторыкам, пасля школы падавала дакументы ў Вільнюскі універсітэт, але гэта быў час, калі скарачалі набор у рускамоўныя групы і мне ўвогуле не прыйшлося здаваць экзамены. Тады я падала дакументы ў Мінскі педагагічны інстытут імя М.Горкага. У гутарках з Н.В.Фокінай я пачула шмат цікавага аб прафесіі бібліятэкара і падала дакументы на бібліятэчны, а не на гістарычны факультэт. І ніколі не шкадавала аб выбраным шляху. Пасля інстытута працавала загадчыцай вайсковай бібліятэкі, таксама ў навукова-тэхнічнай бібліятэцы СКБ аўтаматычных ліній, але міжволі была пастаянна звязана з факультэтам. Скончыла аспірантуру ў Маскоўскім дзяржаўным інстытуце культуры, абараніла дысертацыю і далей працавала толькі на факультэце.

**– Працуючы шмат год у сістэме падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў, Вы вучылі многіх у нашай прафесіі спецыялістаў. Каго Вы лічыце сваімі вучнямі?**

– Студэнцтва – гэта аб'яднанне людзей, характэрныя рысы якіх пераходзяць з пакалення ў пакаленне. Яны не залежаць ад узросту. Значныя змены адбыліся ў студэнцтве, асабліва сярод завочнікаў. Калі раней на факультэце завочнага навучання вучыліся людзі розных узростаў, сярод іх і сталыя, то зараз пераважна маладыя. Каго я вучыла? З аднаго боку, бадай усе працуючыя ў бібліятэках спецыялісты – мае вучні. З другога боку, не кожнага педагог можа лічыць сваім вучнем, якую б пасаду ён не займаў. У пэўнай ступені хацелася б лічыць сваімі вучнямі практычных супрацоўнікаў бібліятэк Р.Н. Сухаруківу, У.М. Сароку, А. Кавалеўскага, М. Хаменка, В. Чыстую, Н. Вінакураву, А. і Т. Керус, З. Шусціцкую, нават і не працуючых у бібліятэках. Я ўдзельнічала таксама ў падрыхтоўцы такіх людзей, як А. Бяловай – чэмпіёнкі свету па фехтаванні, А. Федарэнкі – намесніка галоўнага рэдактара часопіса «Полымя», пісьменніка. Сярод працуючых на факультэце выкладчыкаў таксама ёсць мае выпускнікі – гэта М.А. Яцэвіч, Н.В. Алянюк, В.А. Касап. З усімі выпускнікамі вельмі прыемна сустракацца на канферэнцыях, у розных бібліятэках.

**– У гэтым годзе нашаму факультэту спаўняецца 60 гадоў. Гэта таксама і юбілейны год вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў. Ці не здаецца Вам сімвалічным супадзенне гэтых дат?**

– Так, я згодна, што нічога выпадковага не бывае. У

**Да 60-годдзя факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый**

нашай рэспубліцы, разбуранай вайной, прымаецца рашэнне аб стварэнні бібліятэчнага факультэта. 60 год для факультэта – не так ужо і многа ў параўнанні з буйнымі ВНУ свету, але для нашай краіны гэта дастаткова.

**– Хто, на Вашу думку, павінен рыхтаваць бібліятэкараў?**

– Безумоўна, падрыхтоўку будучых спецыялістаў павінны ажыццяўляць падрыхтаваныя, кваліфікаваныя педагогі. Зараз у нашай краіне адчыняюцца аддзяленні, набіраюцца групы ў іншых ВНУ, дзе пачынаюць рыхтаваць бібліятэкараў. Тут галоўным лічу, каб пры падрыхтоўцы кадраў былі створаны неабходныя ўмовы і былі кваліфікаваныя выкладчыкі, матэрыяльна-тэхнічная база. Ніхто не адмяняў палажэння аб адкрыцці спецыяльнасцей і спецыялізацый, калі ёсць пэўная колькасць спецыялістаў з вучонымі ступенямі. У Нацыянальнай бібліятэцы, калі ўмовы, аб якіх я казала, будуць выкананы, можна займацца перападрыхтоўкай кадраў з іншай базавай падрыхтоўкай па скарочанай праграме.

**– Як Вам бачыцца будучае бібліятэчнай прафесіі? Па якіх накірунках (спецыяльнасцях, спецыялізацыях), на Вашу думку, неабходна рыхтаваць бібліятэчныя кадры?**

– Прафесія бібліятэкара вечная. Канечне, будуць мяняцца ўмовы ў сувязі з укараненнем інфармацыйных тэхналогій, гэта цягне за сабой змены ў падрыхтоўцы кадраў. Нічога пастаяннага не можа быць. За ўвесь перыяд існавання факультэта мы вялі падрыхтоўку кадраў па тыпах бібліятэк, па функцыянальных спецыялізацыях, галіновых комплексах літаратуры. Лічу, што неабходна было б арганізаваць вывучэнне патрэбнасці ў кадрах з пункту гледжання функцыянальнай спецыялізацыі. Тады б гэта быў правільны шлях. На жаль, мы рэдка маглі размеркаваць выпускнікоў у адпаведнасці з функцыянальнай спецыялізацыяй. Магчыма, у будучым зноў з'явіцца магчымасць падрыхтоўкі кадраў па функцыянальнай спецыялізацыі.

Для якаснай падрыхтоўкі кадраў неабходна, каб факультэт меў неабходную матэрыяльную базу. Мы павінны працаваць на новым абсталяванні з сучаснымі прыкладнымі праграмамі, ісці наперадзе бібліятэк. Неабходна аснасціць факультэт і бібліятэку універсітэта, каб пераўтварыць іх у сапраўдную сучасную лабараторыю падрыхтоўкі кадраў. Гэта было б карысна і для бібліятэк.

Ёсць пажаданне і роднаму факультэту: каб мы забяспечвалі падрыхтоўку кадраў для ўсіх тыпаў бібліятэк. Мы падрыхтавалі каля 15 тысяч бібліятэкараў. Насуперак усяму, нельга скарачаць набор на факультэт, нельга зніжаць навуковы патэнцыял нашых выкладчыкаў. Зараз на факультэце працуе 70% спецыялістаў са званнямі і ступенямі. Я жадаю роднаму факультэту мацнець і пашырацца.

*Падрыхтавала*
***Касап В. А.***

Любоў Даніленка

# Першая вытворчая – моманты ісціны



Магчыма, ніхто са студэнтаў чацвёртага курса факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры, якія праходзілі першую вытворчую практыку па спецыяльнасці «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі на працягу дзесяці тыдняў, ні разу непасрэдна не згадаў тэзіс аб тым, што практыка ёсць крытэрый ісціны, не задумаўся аб яго аўтарстве. У агульных палажэннях праграмы вытворчай практыкі пра гэта сказана больш проста: «Практыка мае на мэце паглыбленне і пашырэнне тэарэтычных ведаў і фарміраванне практычных навыкаў студэнтаў па бібліятэчных фондах, каталагізацыі дакументаў, бібліятэчным і бібліяграфічным абслугоўванні». Тым не менш, менавіта гэтым – пошукам, адкрыццём, доказам, усведамленнем (для каго – прапісных, а для каго яшчэ толькі знойдзеных) ісцін быў, як чырвонаю ніткаю, пранізаны кожны дзень вытворчай практыкі ў галоўнай бібліятэцы краіны.

Яшчэ 29 сакавіка 2004 г. Раман Абрамчук, Наталля Агароднікава, Надзея Бакштаева, Наталля Быліна, Ірына Грыгарэнка, Юлія Каберник, Вольга Лук'янава, Вольга Парало, Юлія Петух, Таццяна Поўх, Аляксандр Скараход, Кацярына Таболіч, Ірына Шарамет, Наталля і Таццяна Ягорчанкі ўвайшлі ў будынак бібліятэкі з традыцыйным самаадчуваннем яе пастаяннага наведвальніка, чытача. А ўжо 4 чэрвеня яны зачынялі дзверы яе параднага ўваходу з беражлівасцю гаспадароў – супрацоўнікаў.

Паміж гэтымі датамі праходзілі выпрабаванне веды, атрыманыя пад час вучэбных заняткаў ва універсітэце, незаўважна, паступова фарміраваліся ўменні і навыкі, да кожнага прыходзілі пытанні, на якія шукаліся адказы, здараліся радасці адкрыццяў, марылася пра будучыню Нацыянальнай бібліятэкі.

Набыткі кожнага студэнта паасобку і групы ў цэлым і сталі тымі *момантамі ісціны*, праз якія ішла зацікаўленая размова студэнтаў з супрацоўнікамі бібліятэкі і выкладчыкамі універсітэта на абароне вытворчай практыкі.

*Момант першы.* У выніку праходжання практыкі студэнты ўсвядомілі сябе ў будучай прафесіі. Яны пераканаліся ў правільнасці зробленага выбару. Адны ўжо бачаць сябе супрацоўнікамі аддзела абслугоўвання, другія – даведачна-бібліяграфічнага, трэція – аддзела індэксавання і апрацоўкі дакументаў. Як зазначыла Н. Быліна, пасля праходжання практыкі яе ўяўленне пра будучую прафесію змянілася ў лепшы бок. Яшчэ больш пераканаўчай была І. Шарамет, якая кожны раз, гаворачы пра Нацыянальную, называла яе не інакш, як «наша бібліятэка».

*Момант другі.* Праходжанне практыкі ў асноўных функцыянальных аддзелах Нацыянальнай бібліятэкі ўзбагаціла студэнтаў ведамі аб структуры бібліятэкі, тэхналогіях, якія ў ёй выкарыстоўваюцца. Сёстры Ягорчанкі, напрыклад, былі прыемна ўражаныя разнастайнасцю паслуг, што аказваюцца Нацыянальнай бібліятэкай розным катэгорыям карыстальнікаў, у тым ліку платных, наяўнасцю такой паслугі, як кансультаванне новых чытачоў, скрупулёзнасцю штодзённага вядзення статыстычнага ўліку. Станоўчым

у дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі студэнты лічаць бясплатнасць асноўных традыцыйных бібліятэчных і бібліяграфічных паслуг. Былі і нечаканыя здзіўленні: «высветлілася, что чытачы даволі часта лічаць, што напісанне дакладнай назвы выдання і шыфраў не заслугоўвае ўвагі, і таму патрэбны немалыя намаганні, каб даведацца, што ж чытачоў на самой справе цікавіць» (Ю. Петух).

*Момант трэці.* Вытворчая практыка пацвердзіла неабходнасць грунтоўнай тэарэтычнай універсітэцкай падрыхтоўкі бібліятэкараў. Менавіта фундаментальнасць тэарэтычных ведаў дала магчымасць Н. Агароднікавай узняць праблему камплектавання фондаў Нацыянальнай бібліятэкі абавязковым экзэмплярам і прававога забеспячэння гэтага пытання, а Ю. Петух – заўважыць праблему відавой ідэнтыфікацыі дакументаў пры камплектаванні, апрацоўцы фондаў і ў працэсе іх выкарыстання. В. Лук'янаву, мабыць, не выпадкова захапіў удзел у маніторынгу запытаў карыстальнікаў бібліятэкі.

*Момант чацвёрты.* Нацыянальная бібліятэка Беларусі – буйнейшая інфармацыйная ўстанова краіны. Клопатам пра яе будучыню, будучыню бібліятэчнай справы Беларусі ў цэлым, а, магчыма, і сваю ўласную (нездарма ж студэнты, апрача праграмы практыкі, прынялі ўдзел у падрыхтоўцы праграмы пераезду ў новы будынак) абумоўлена занепакоенасць практыкантаў наяўнасцю «вузкіх месцаў» у бібліятэчнай тэхналогіі. Студэнтамі зроблены шматлікія прапановы па ўдасканаленні дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі, сярод якіх:

• забеспячэнне захаванасці яе унікальных фондаў, пераклад рукапісаў, рэдкіх кніг, дысертацый і іншых дакументаў на лічбавыя носьбіты (Н. Бакштаева);

• дыферэнцыяцыя кошту платных паслуг для сацыяльна неабароненых катэгорый карыстальнікаў, у т.л. студэнтаў;

• афармленне нагляднай, яркай, з выразнымі малюнкамі, схемы Нацыянальнай бібліятэкі, «падобнай на карту горада з вышыні птушынага палёту ці схему маскоўскага метро» (Р. Абрамчук);

• стварэнне дзіцячага пакоя, у якім маглі б праводзіць час дзеці, пакуль іх бацькі працуюць у чытальных залах бібліятэкі (В. Парало);

• правядзенне з удзелам студэнтаў-практыкантаў ФІДК мерапрыемстваў у падшэфным дзіцячым доме, дзе можна было б рэалізаваць і прафарыентацыйныя задачы, зацікавіць выхаванцаў дзіцячага дома бібліятэчнай прафесіяй (Н. Быліна).

Аддзелу камплектавання Н. Быліна раіць пераняць вопыт бібліятэк ЗША па выкарыстанні дадатковых крыніц фінансавання камплектавання фондаў бібліятэкі.

Студэнт спецыялізацыі «Аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы» А. Скараход прапануе Нацыянальнай бібліятэцы «нарэшце набыць АБІС, якая адпавядала б усім сучасным нормам і патрабаванням», «каб у новай бібліятэцы інтэрфейс электроннага каталога быў больш дружалюбным, каб надавалася больш увагі і выдзялялася сродкаў на аблічбоўку дакументаў, што забяспечыла б магчымасць карыстання імі ў рэжыме аддаленага доступу».

На экалагічныя аспекты дзейнасці бібліятэкі звярнулі ўвагу В. Парало і Ю. Кабернік. Іх непакоіць праблема курэння ў бібліятэцы, скаргі цяжарных жанчын – карыстальнікаў бібліятэкі – на адсутнасць спецыяльна адведзенага для гэтага месца, а таксама ступень асвятлення, тэмпературна-гігіенічны рэжым захавання фонду і працы супрацоўнікаў бібліятэкі (асабліва ў кнігасховішчы). Студэнты спадзяюцца, што «ў новай Нацыянальнай бібліятэцы будуць спрыяльныя ўмовы як для дакументаў, так і для чытатоў і супрацоўнікаў бібліятэкі».

«Глабальная прапанова» Р. Абрамчука – «зрабіць у бібліятэцы даведачную службу, якая канкурыравала б з камерцыйным бюро даведак «085». Нацыянальная бібліятэка, лічыць ён, мае, акрамя гучнага імя, якое адразу выклікае давер, яшчэ і магутную інфармацыйную базу. Ён прапанаваў таксама размяшчаць рэкламу платных паслуг у эканамічна выгадных месцах, а інфармацыю пра мерапрыемствы – ва ўстановах культуры, на іх сайтах, пра экскурсіі і кніжныя выставы – у школах і іншых навучальных установах.



*Момант пяты.* Самае вялікае ўражанне студэнтаў – «ад людзей, якія працуюць у Нацыянальнай бібліятэцы». Добразычлівасць і прафесійны давер да студэнтаў-практыкантаў не засталіся незаўважанымі. Студэнты адказалі на гэта добрасумленнымі адносінамі да працы і зацікаўленасцю. Усе практыканты адзначылі высокі агульнакультурны і прафесійны ўзровень супрацоўнікаў бібліятэкі. Заўважылі яны і тое, што праца ў розных структурных падраздзяленнях патрабуе ад бібліятэчнага спецыяліста і выяўляе ў ім розныя якасці. У аддзеле кнігасховішча патрэбна добрае веданне фонду, яго размяшчэння ў прасторы. Нягледзячы на розныя прычыны, бібліятэкары імкнуцца забяспечыць хуткасць выканання заказаў. Супрацоўнікам аддзела абслугоўвання патрэбна веданне псіхалогіі чытача, «свой» падыход да кожнага.

*Момант шосты.* Дыяпазон прапаноў па ўдасканаленні падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый, зробленых студэнтамі-практыкантамі, шырокі: ад адкрыцця новых спецыялізацый да больш дэталёвага вывучэння вобласці заўваг бібліяграфічнага апісання. Амаль аднагалосна студэнты прапанавалі пачынаць вытворчую практыку раней, з трэцяга або нават другога курсаў. У гэтым жа рэчышчы і іх прапанова зрабіць абавязковым штогадовае знаёмства студэнтаў-першакурснікаў факультэта з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі ў рамках курса «Уводзіны ў спецыяльнасць». Шырокае вывучэнне вопыту Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі неабходна ва ўсіх спецыяльных вучэбных дысцыплінах. Студэнты выказалі пажаданне, каб на базе бібліятэкі часцей праходзілі практычныя заняткі. «Працуючы ў бібліятэцы, – сцвярджае Ю. Кабернік, – адчуваеш вялікую адказнасць нават за правільнасць выбару індэксу ББК ці УДК».

На думку практыкантаў, у вучэбным працэсе варта больш увагі надаваць электронным бібліятэкам, выкарыстанню баз дадзеных, міжнароднаму кнігаабмену.

А спецыялізацыю Р. Абрамчук прапануе такую: «Бібліятэкар-бібліёграф, майстар рэкламы і PR». Такія спецыялісты, на яго думку, дапамаглі б «стварыць сапраўды прыстойны, годны, эфектыўны імідж бібліятэкі як сацыяльнага інстытута».

Упэўнена, што выхаванцы факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый, якія так глыбока зацікаўлены праблемамі развіцця Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, бібліятэчнай справы і бібліятэчнай адукацыі краіны, не згубяць свой творчы патэнцыял і ў хуткім часе гэтак жа годна і эфектыўна будуць памнажаць інтэлектуальную і духоўную спадчыну роднай Беларусі.



# З любоўю да бібліятэчнай справы

## Да 60-годдзя факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый

Педагагічная і навуковая дзейнасць шэрага выкладчыкаў спецыяльных дысцыплін непарыўна звязана з гісторыяй факультэта. Непасрэдны ўдзел у яго станаўленні і развіцці прымалі такія яркія асобы, як К.С. Верабей, А.Ф. Галуза, Н.М. Калоска, Р.І. Кучур, М.І. Савачкіна, В.Е. Лявончыкаў, Р.А. Ровіна і інш. Адным з актыўнейшых удзельнікаў у гады станаўлення і развіцця факультэта была кандыдат гістарычных навук, дацэнт І.П.Емец, якая і да сённяшняга дня паспяхова займаецца навуковай дзейнасцю ў галіне гісторыі бібліятэчнай справы. З нагоды юбілею з І.П. Емец сустрэлася кандыдат гістарычных навук, прафесар Н.А. Ляйко.

**Ірма Пятроўна, на працягу 25 гадоў Ваша дзейнасць была непарыўна звязана з Мінскім педагагічным інстытутам імя А.М.Горкага, Мінскім інстытутам культуры, затым Беларускім універсітэтам культуры. Чым былі адметныя гэтыя гады? Вам ёсць аб чым успомніць: студэнтка-завочніца, выкладчыца, намеснік дэкана, дацэнт. Гісторыя факультэта і Ваша жыццё непарыўна звязаны.**

– Кнігу і бібліятэку я палюбіла з дзяцінства. У маіх бацькоў была вялікая бібліятэка, якая ў асноўным складалася з рускай і замежнай класікі, медыцынскай літаратуры і нават была частка літаратуры па архітэктуры і будаўніцтву. Першае знаёмства з бібліятэкай як культурным інстытутам было звязана са 100-гадовым юбілеем А.С. Пушкіна, калі мае бацькі ўпершыню прывялі мяне ў дзіцячы аддзел бібліятэкі імя А.С. Пушкіна, якая ў той час знаходзілася на вуліцы Інтэрнацыянальнай. Першай кнігай, якую я ўзяла ў бібліятэцы, былі казкі А.С. Пушкіна. Па выхадных мне іх чытала мама, а потым я сама чытала іх сваім малодшым братам. Другой любімай кнігай была «Хижина дяди Тома» Бічэр-Стоу. Яна мне вельмі запомнілася, таму што, знаходзячыся з малодшымі братамі ў Латвіі ў час нямецка-фашысцкай акупацыі, з дапамогай гэтай кнігі я вывучыла латышскую мову.

Калі я вучылася ў школе, то перавагу аддавала такім прадметам, як літаратура, гісторыя і геаграфія. Мяне заўсёды цікавілі пытанні: як жылі людзі ў розных рэгіёнах, краінах, кантынентах, які іх жыццёвы ўклад і традыцыі, чаму менавіта такім чынам ішло развіццё грамадства і інш.

Пры выбары прафесіі ў мяне не ўзнікала ніякіх пытанняў. Я была не проста чытачкай бібліятэкі, але і доўгі час на грамадскіх пачатках працавала ў бібліятэцы імя Маміна-Сібірака ў г. Чэлябінску (сямейныя абставіны не дазвалялі мне працаваць пастаянна). Затым я працавала на пасадзе бібліятэкара абанемента, а потым – загадчыцай чытальнай залы. Працуючы ў бібліятэцы, я завочна закончыла бібліятэчны тэхнікум і бібліятэчны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага. Мае курсавыя работы былі прысвечаны бібліятэчнай справе асобных рэгіёнаў, гісторыі асобных бібліятэк і бібліятэкарам-энтузіястам. Таму калі я прыйшла працаваць на кафедру бібліятэказнаўства Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага (1969 г.), пачала выкладаць курс «Гісторыя бібліятэчнай справы ў СССР і за мяжой». З гэтага часу мая працоўная і навуковая дзейнасць была непарыўна звязана з факультэтам, Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі і архівамі.

**Раскажыце, калі ласка, чым жылі, цікавіліся, займаліся, аб чым марылі студэнты і выкладчыкі 70 – 90-х гадоў.**

– Педагагічнай дзейнасцю я займалася 25 гадоў. Старэйшы калегай такіх выкладчыкаў, як Н.М. Калоска, Р.М. Кучур, В.Е. Лявончыкаў, Л.М. Буракіна, М.І. Савачкіна, Т.М. Сакалова і інш., я вучылася ў іх методыцы выкладання, валоданню аўдыторыяй студэнтаў. Я многа працавала ў бібліятэцы, каб назапасіць як мага больш ведаў па сусветнай гісторыі бібліятэчнай справы для таго, каб заняткі зрабіць цікавымі для студэнтаў. Адначасова распрацоўвала новы курс «Гісторыя бібліятэчнай справы ў БССР», старалася паказаць асаблівасці і прыярытэтныя накірункі ў развіцці айчыннага бібліятэказнаўства, што ў Беларусі ў галіне бібліятэчнай справы працуюць высокакваліфікаваныя спецыялісты не толькі тэарэтыкі, але і супрацоўнікі бібліятэк – метадысты, практыкі. Вельмі прыемна, што некаторыя з лепшых студэнтаў, якія цягнуліся да навукі, з цягам часу сталі сур'ёзна займацца ёю, абаранілі кандыдацкія і доктарскія дысертацыі. Сярод іх: доктар педагагічных навук, дацэнт Р.С. Матульскі, дацэнты С.А. Паўлава, В.І. Саітава, загадчыца кафедры менеджменту дакументнай сферы дацэнт С.В. Зыгмантовіч, дэканы факультэтаў прафесар М.А. Яцэвіч, дацэнт Н.В. Алянюк і інш.

Цікавыя, але даволі складаныя для факультэта былі канец 60-х – пачатак 70-х гг., калі мы былі ў складзе педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага і размяшчаліся ў былым інтэрнаце на вуліцы С.М. Кірава. У той час я працавала намеснікам дэкана разам з М.І. Савачкінай, якую студэнты, лічылі адным з лепшых выкладчыкаў. Дэканам факультэта быў А.Ф. Галуза, яго вельмі любілі і паважалі студэнты.

Трэба адзначыць, што студэнты 70-х гг. былі духоўна багатымі, зацікаўленымі не толькі вучобай, але і прымалі актыўны ўдзел у культурным жыцці. Яны не засяроджвалі ўвагу на тым, што было цесна ў інтэрнаце і ў аўдыторыях, лекцыі часта пісалі не за сталом, а на партфелях і сумках у маленькіх аўдыторыях, затое пасля заняткаў наведвалі Дзяржаўную бібліятэку БССР імя У.І. Леніна, якая знаходзілася зусім блізка і ёю было вельмі зручна карыстацца, а вечарамі і ў выхадныя дні наведвалі тэатры і кіно, музеі, канцэрты, выставы, стараліся як мага болей назапасіць усебаковых ведаў, каб потым іх выкарыстаць у сваёй будучай рабоце, данесці да чытачоў. Часта і мяне (я таксама была куратарам) студэнты запрашалі наведаць тэатр. Потым мы разам абмяркоўвалі спектаклі і новыя кінафільмы. Гэта было цікава, і я старалася зразумець іх і жыць іх жыццём.

**Ірма Пятроўна, якія ўражанні, успаміны засталіся ў вас ад кафедры бібліятэказнаўства, яе калектыву.**

– Безумоўна, гэта я не магу абмінуць. На кафедры я працавала ўвесь час. Тут быў створаны працалюбівы, добразычлівы, творчы калектыў у той час, калі кафедрай загадвалі дацэнты Н.М. Калоска, В.Ф. Якіменка і У.А. Акуліч. А душой калектыву была цудоўная памочніца не толькі загадчыка кафедры і выкладчыкаў, але і студэнтаў і аспірантаў, добрай душы і сапраўднай прафесійнай адказнасці чалавек – Т.М. Крыкунова. Мы ведалі, што яна нікога не падвядзе. З ёю было вельмі прыемна працаваць.

**Ваша педагагічная дзейнасць цесна звязана з навуковай. Шчаслівае супадзенне. Чытаючы лекцыі, Вы часта ўзбагачалі іх рэдкімі архіўнымі матэрыяламі, падкрэслівалі асобныя важныя моманты, раскрываючы агульнае і асабістае. Ад гэтага Вашы лекцыі былі заўсёды цікавымі, і студэнты стараліся іх запісаць, ведалі, што ў падручніку гэтага не знойдзеш. Вы шырока выкарыстоўвалі дадатковыя крыніцы па праблемах развіцця культуры і нават мастацкія творы, у якіх адлюстроўваліся падзеі пэўнага гістарычнага перыяду.**

– Так, гэта сапраўды шчаслівае супадзенне. Я займаюся такой навуковай дзейнасцю, якая адпавядае маім жаданням,

у дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі студэнты лічаць бясплатнасць асноўных традыцыйных бібліятэчных і бібліяграфічных паслуг. Былі і нечаканыя здзіўленні: «высветлілася, что чытачы даволі часта лічаць, што напісанне дакладнай назвы выдання і шыфраў не заслугоўвае ўвагі, і таму патрэбны немалыя намаганні, каб даведацца, што ж чытачоў на самой справе цікавіць» (Ю. Петух).

*Момант трэці.* Вытворчая практыка пацвердзіла неабходнасць грунтоўнай тэарэтычнай універсітэцкай падрыхтоўкі бібліятэкараў. Менавіта фундаментальнасць тэарэтычных ведаў дала магчымасць Н. Агароднікавай узняць праблему камплектавання фондаў Нацыянальнай бібліятэкі абавязковым экзэмплярам і прававога забеспячэння гэтага пытання, а Ю. Петух – заўважыць праблему відавой ідэнтыфікацыі дакументаў пры камплектаванні, апрацоўцы фондаў і ў працэсе іх выкарыстання. В. Лук'янаву, мабыць, не выпадкова захапіў удзел у маніторынгу запытаў карыстальнікаў бібліятэкі.

*Момант чацвёрты.* Нацыянальная бібліятэка Беларусі – буйнейшая інфармацыйная ўстанова краіны. Клопатам пра яе будучыню, будучыню бібліятэчнай справы Беларусі ў цэлым, а, магчыма, і сваю ўласную (нездарма ж студэнты, апрача праграмы практыкі, прынялі ўдзел у падрыхтоўцы праграмы пераезду ў новы будынак) абумоўлена занепакоенасць практыкантаў наяўнасцю «вузкіх месцаў» у бібліятэчнай тэхналогіі. Студэнтамі зроблены шматлікія прапановы па ўдасканаленні дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі, сярод якіх:

• забеспячэнне захаванасці яе унікальных фондаў, пераврд рукапісаў, рэдкіх кніг, дысертацый і іншых дакументаў на лічбавыя носьбіты (Н. Бакштаева);

• дыферэнцыяцыя кошту платных паслуг для сацыяльна неабароненых катэгорый карыстальнікаў, у т.л. студэнтаў;

• афармленне нагляднай, яркай, з выразнымі малюнкамі, схемы Нацыянальнай бібліятэкі, «падобнай на карту горада з вышыні птушынага палёту ці схему маскоўскага метро» (Р. Абрамчук);

• стварэнне дзіцячага пакоя, у якім маглі б праводзіць час дзеці, пакуль іх бацькі працуюць у чытальных залах бібліятэкі (В. Парало);

• правядзенне з удзелам студэнтаў-практыкантаў ФІДК мерапрыемстваў у падшэфным дзіцячым доме, дзе можна было б рэалізаваць і прафарыентацыйныя задачы, зацікавіць выхаванцаў дзіцячага дома бібліятэчнай прафесіяй (Н. Быліна).

Аддзелу камплектавання Н. Быліна раіць пераняць вопыт бібліятэк ЗША па выкарыстанні дадатковых крыніц фінансавання камплектавання фондаў бібліятэкі.

Студэнт спецыялізацыі «Аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы» А. Скараход прапануе Нацыянальнай бібліятэцы «нарэшце набыць АБІС, якая адпавядала б усім сучасным нормам і патрабаванням», «каб у новай бібліятэцы інтэрфейс электроннага каталога быў больш дружалюбным, каб надавалася больш увагі і выдзялялася сродкаў на аблічбоўку дакументаў, што забяспечыла б магчымасць карыстання імі ў рэжыме аддаленага доступу».

На экалагічныя аспекты дзейнасці бібліятэкі звярнулі ўвагу В. Парало і Ю. Кабернік. Іх непакоіць праблема курэння ў бібліятэцы, скаргі цяжарных жанчын – карыстальнікаў бібліятэкі – на адсутнасць спецыяльна адведзенага для гэтага месца, а таксама ступень асвятлення, тэмпературна-гігіенічны рэжым захавання фонду і працы супрацоўнікаў бібліятэкі (асабліва ў кнігасховішчы). Студэнты спадзяюцца, што «ў новай Нацыянальнай бібліятэцы будуць спрыяльныя ўмовы як для дакументаў, так і для чытатоў і супрацоўнікаў бібліятэкі».

«Глабальная прапанова» Р. Абрамчука – «зрабіць у бібліятэцы даведачную службу, якая канкурыравала б з камерцыйным бюро даведак «085». Нацыянальная бібліятэка, лічыць ён, мае, акрамя гучнага імя, якое адразу выклікае давер, яшчэ і магутную інфармацыйную базу. Ён прапанаваў таксама размяшчаць рэкламу платных паслуг у эканамічна выгадных месцах, а інфармацыю пра мерапрыемствы – ва ўстановах культуры, на іх сайтах, пра экскурсіі і кніжныя выставы – у школах і іншых навучальных установах.



*Момант пяты.* Самае вялікае ўражанне студэнтаў – «ад людзей, якія працуюць у Нацыянальнай бібліятэцы». Добразычлівасць і прафесійны давер да студэнтаў-практыкантаў не засталіся незаўважанымі. Студэнты адказалі на гэта добрасумленнымі адносінамі да працы і зацікаўленасцю. Усе практыканты адзначылі высокі агульнакультурны і прафесійны ўзровень супрацоўнікаў бібліятэкі. Заўважылі яны і тое, што праца ў розных структурных падраздзяленнях патрабуе ад бібліятэчнага спецыяліста і выяўляе ў ім розныя якасці. У аддзеле кнігасховішча патрэбна добрае веданне фонду, яго размяшчэння ў прасторы. Нягледзячы на розныя прычыны, бібліятэкары імкнуцца забяспечыць хуткасць выканання заказаў. Супрацоўнікам аддзела абслугоўвання патрэбна веданне псіхалогіі чытача, «свой» падыход да кожнага.

*Момант шосты.* Дыяпазон прапаноў па ўдасканаленні падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый, зробленых студэнтамі-практыкантамі, шырокі: ад адкрыцця новых спецыялізацый да больш дэталёвага вывучэння вобласці заўваг бібліяграфічнага апісання. Амаль аднагалосна студэнты прапанавалі пачынаць вытворчую практыку раней, з трэцяга або нават другога курсаў. У гэтым жа рэчышчы і іх прапанова зрабіць абавязковым штогадовае знаёмства студэнтаў-першакурснікаў факультэта з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі ў рамках курса «Уводзіны ў спецыяльнасць». Шырокае вывучэнне вопыту Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі неабходна ва ўсіх спецыяльных вучэбных дысцыплінах. Студэнты выказалі пажаданне, каб на базе бібліятэкі часцей праходзілі практычныя заняткі. «Працуючы ў бібліятэцы, – сцвярджае Ю. Кабернік, – адчуваеш вялікую адказнасць нават за правільнасць выбару індэксу ББК ці УДК».

На думку практыкантаў, у вучэбным працэсе варта больш увагі надаваць электронным бібліятэкам, выкарыстанню баз дадзеных, міжнароднаму кнігаабмену.

А спецыялізацыю Р. Абрамчук прапануе такую: «Бібліятэкар-бібліёграф, майстар рэкламы і PR». Такія спецыялісты, на яго думку, дапамаглі б «стварыць сапраўды прыстойны, годны, эфектыўны імідж бібліятэкі як сацыяльнага інстытута».

Упэўнена, што выхаванцы факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый, якія так глыбока зацікаўлены праблемамі развіцця Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, бібліятэчнай справы і бібліятэчнай адукацыі краіны, не згубяць свой творчы патэнцыял і ў хуткім часе гэтак жа годна і эфектыўна будуць памнажаць інтэлектуальную і духоўную спадчыну роднай Беларусі.



# З любоўю да бібліятэчнай справы

## Да 60-годдзя факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый

Педагагічная і навуковая дзейнасць шэрага выкладчыкаў спецыяльных дысцыплін непарыўна звязана з гісторыяй факультэта. Непасрэдны ўдзел у яго станаўленні і развіцці прымалі такія яркія асобы, як К.С. Верабей, А.Ф. Галуза, Н.М. Калоска, Р.І. Кучур, М.І. Савачкіна, В.Е. Лявончыкаў, Р.А. Ровіна і інш. Адным з актыўнейшых удзельнікаў у гады станаўлення і развіцця факультэта была кандыдат гістарычных навук, дацэнт І.П.Емец, якая і да сённяшняга дня пасляхова займаецца навуковай дзейнасцю ў галіне гісторыі бібліятэчнай справы. З нагоды юбілею з І.П. Емец сустрэлася кандыдат гістарычных навук, прафесар Н.А. Ляйко.

Ірма Пятроўна, на працягу 25 гадоў Ваша дзейнасць была непарыўна звязана з Мінскім педагагічным інстытутам імя А.М.Горкага, Мінскім інстытутам культуры, затым Беларускім універсітэтам культуры. Чым былі адметныя гэтыя гады? Вам ёсць аб чым успомніць: студэнтка-завочніца, выкладчыца, намеснік дэкана, дацэнт. Гісторыя факультэта і Ваша жыццё непарыўна звязаны.

– Кнігу і бібліятэку я палюбіла з дзяцінства. У маіх бацькоў была вялікая бібліятэка, якая ў асноўным складалася з рускай і замежнай класікі, медыцынскай літаратуры і нават была частка літаратуры па архітэктуры і будаўніцтву. Першае знаёмства з бібліятэкай як культурным інстытутам было звязана са 100-гадовым юбілеем А.С. Пушкіна, калі мае бацькі ўпершыню прывялі мяне ў дзіцячы аддзел бібліятэкі імя А.С. Пушкіна, якая ў той час знаходзілася на вуліцы Інтэрнацыянальнай. Першай кнігай, якую я ўзяла ў бібліятэцы, былі казкі А.С. Пушкіна. Па выхадных мне іх чытала мама, а потым я сама чытала іх сваім малодшым братам. Другой любімай кнігай была «Хижина дяди Тома» Бічэр-Стоу. Яна мне вельмі запомнілася, таму што, знаходзячыся з малодшымі братамі ў Латвіі ў час нямецка-фашысцкай акупацыі, з дапамогай гэтай кнігі я вывучыла латышскую мову.

Калі я вучылася ў школе, то перавагу аддавала такім прадметам, як літаратура, гісторыя і геаграфія. Мяне заўсёды цікавілі пытанні: як жылі людзі ў розных рэгіёнах, краінах, кантынентах, які іх жыццёвы ўклад і традыцыі, чаму менавіта такім чынам ішло развіццё грамадства і інш.

Пры выбары прафесіі ў мяне не ўзнікала ніякіх пытанняў. Я была не проста чытачкай бібліятэкі, але і доўгі час на грамадскіх пачатках працавала ў бібліятэцы імя Маміна-Сібірака ў г. Чэлябінску (сямейныя абставіны не дазвалялі мне працаваць пастаянна). Затым я працавала на пасадзе бібліятэкара абанемента, а потым – загадчыцай чытальнай залы. Працуючы ў бібліятэцы, я завочна закончыла бібліятэчны тэхнікум і бібліятэчны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага. Мае курсавыя работы былі прысвечаны бібліятэчнай справе асобных рэгіёнаў, гісторыі асобных бібліятэк і бібліятэкарам-энтузіястам. Таму калі я прыйшла працаваць на кафедру бібліятэказнаўства Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага (1969 г.), пачала выкладаць курс «Гісторыя бібліятэчнай справы ў СССР і за мяжой». З гэтага часу мая працоўная і навуковая дзейнасць была непарыўна звязана з факультэтам, Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі і архівамі.

Раскажыце, калі ласка, чым жылі, цікавіліся, займаліся, аб чым марылі студэнты і выкладчыкі 70 – 90-х гадоў.

– Педагагічнай дзейнасцю я займалася 25 гадоў. Стаўшы калегай такіх выкладчыкаў, як Н.М. Калоска, Р.М. Кучур, В.Е. Лявончыкаў, Л.М. Буракіна, М.І. Савачкіна, Т.М. Сакалова і інш., я вучылася ў іх методыцы выкладання, валоданню аўдыторыяй студэнтаў. Я многа працавала ў бібліятэцы, каб назапасіць як мага больш ведаў па сусветнай гісторыі бібліятэчнай справы для таго, каб заняткі зрабіць цікавымі для студэнтаў. Адначасова распрацоўвала новы курс «Гісторыя бібліятэчнай справы ў БССР», старалася паказаць асаблівасці і прыярытэтныя накірункі ў развіцці айчыннага бібліятэказнаўства, што ў Беларусі ў галіне бібліятэчнай справы працуюць высокакваліфікаваныя спецыялісты не толькі тэарэтыкі, але і супрацоўнікі бібліятэк – метадысты, практыкі. Вельмі прыемна, што некаторыя з лепшых студэнтаў, якія цягнуліся да навукі, з цягам часу сталі сур'ёзна займацца ёю, абаранілі кандыдацкія і доктарскія дысертацыі. Сярод іх: доктар педагагічных навук, дацэнт Р.С. Матульскі, дацэнты С.А. Паўлава, В.І. Саітава, загадчыца кафедры менеджменту дакументнай сферы дацэнт С.В. Зыгмантовіч, дэканы факультэтаў прафесар М.А. Яцэвіч, дацэнт Н.В. Алянюк і інш.

Цікавыя, але даволі складаныя для факультэта былі канец 60-х – пачатак 70-х гг., калі мы былі ў складзе педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага і размяшчаліся ў былым інтэрнаце на вуліцы С.М. Кірава. У той час я працавала намеснікам дэкана разам з М.І. Савачкінай, якую студэнты, лічылі адным з лепшых выкладчыкаў. Дэканам факультэта быў А.Ф. Галуза, яго вельмі любілі і паважалі студэнты.

Трэба адзначыць, што студэнты 70-х гг. былі духоўна багатымі, зацікаўленымі не толькі вучобай, але і прымалі актыўны ўдзел у культурным жыцці. Яны не засяроджвалі ўвагу на тым, што было цесна ў інтэрнаце і ў аўдыторыях, лекцыі часта пісалі не за сталом, а на партфелях і сумках у маленькіх аўдыторыях, затое пасля заняткаў наведвалі Дзяржаўную бібліятэку БССР імя У.І. Леніна, якая знаходзілася зусім блізка і ёю было вельмі зручна карыстацца, а вечарамі і ў выхадныя дні наведвалі тэатры і кіно, музеі, канцэрты, выставы, стараліся як мага болей назапасіць усебаковых ведаў, каб потым іх выкарыстаць у сваёй будучай рабоце, данесці да чытачоў. Часта і мяне (я таксама была куратарам) студэнты запрашалі наведаць тэатр. Потым мы разам абмяркоўвалі спектаклі і новыя кінафільмы. Гэта было цікава, і я старалася зразумець іх і жыць іх жыццём.

Ірма Пятроўна, якія ўражанні, успаміны засталіся ў вас ад кафедры бібліятэказнаўства, яе калектыву.

– Безумоўна, гэта я не магу абмінуць. На кафедры я працавала ўвесь час. Тут быў створаны працалюбівы, добразычлівы, творчы калектыў у той час, калі кафедрай загадвалі дацэнты Н.М. Калоска, В.Ф. Якіменка і У.А. Акуліч. А душой калектыву была цудоўная памочніца не толькі загадчыка кафедры І выкладчыкаў, але і студэнтаў і аспірантаў, добрай душы і сапраўднай прафесійнай адказнасці чалавек – Т.М. Крыкунова. Мы ведалі, што яна нікога не падвядзе. З ёю было вельмі прыемна працаваць.

Ваша педагагічная дзейнасць цесна звязана з навуковай. Шчаслівае супадзенне. Чытаючы лекцыі, Вы часта ўзбагачалі іх рэдкімі архіўнымі матэрыяламі, падкрэслівалі асобныя важныя моманты, раскрываючы агульнае і асабістае. Ад гэтага Вашы лекцыі былі заўсёды цікавымі, і студэнты стараліся іх запісаць, ведалі, што ў падручніку гэтага не знойдзеш. Вы шырока выкарыстоўвалі дадатковыя крыніцы па праблемах развіцця культуры і нават мастацкія творы, у якіх адлюстроўваліся падзеі пэўнага гістарычнага перыяду.

– Так, гэта сапраўды шчаслівае супадзенне. Я займаюся такой навуковай дзейнасцю, якая адпавядае маім жаданням,

душэўным парывам. Гэта садзейнічала пастаяннай зацікаўленасці прафесіяй і патрэбнасці ў больш глыбокіх ведах. Каб трымаць на адпаведным узроўні навуковы патэнцыял, я пастаянна папаўняла свае веды, працуючы ў беларускім аддзеле і аддзеле бібліятэказнаўства Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У.І. Леніна. Я з удзячнасцю ўспамінаю супрацоўнікаў бібліятэкі: галоўнага бібліятэкара, цяпер кандыдата педагагічных навук, прафесара Л.А. Дзямешку, загадчыцу аддзела беларускай літаратуры Р.М. Чыгірову, бібліёграфа-даследчыка Н.Б. Ватацы, Л.Н. Навіцкую і інш., з якімі я была цесна звязана не толькі як з памочнікамі кожнага даследчыка, але і як з калегамі па сумеснай рабоце. Разам з Н.Б. Ватацы я прымала ўдзел у рэдагаванні бібліяграфічнага паказальніка «Библиотечное дело в Белоруссии», складзенага Л.Н. Навіцкай. Да гэтага паказальніка была напісана даволі аб'ёмная прадмова, якую студэнты доўгі час выкарыстоўвалі ў якасці вучэбнага матэрыялу па гісторыі бібліятэчнай справы ў Беларусі пакуль не з'явіўся падручнік М.І. Пакала «История библиотечного дела в БССР» (Мн.: Вышэйш. шк., 1986).

Трэба адзначыць, што ў 70-х гг. пастаянна павялічваецца цікавасць да гісторыі бібліятэчнай справы як у навукоўцаў, так і практычных работнікаў. У гэты час пачынае ажыццяўляцца супрацоўніцтва паміж тэарэтыкамі і практыкамі. Так, супрацоўнікамі навукова-даследчага аддзела К.С. Санько, А.А. Маркавай і Л.І. Станкевіч, якія з вялікай любоўю адносіліся да сваёй работы, быў падрыхтаваны зборнік «Библиотечное дело в БССР: Документы и материалы. 1918 – 1941». Ён быў выдадзены ў 1978 г. У сувязі з тым, што я займалася навуковым даследаваннем менавіта гэтага перыяду, мяне запрасілі ўдзельнічаць у рабоце над зборнікам у якасці складальніка. Мною таксама была напісана гістарычная частка прадмовы да зборніка.

**Ірма Пятроўна, я ведаю, што ў многіх, хто займаўся даследаваннем гісторыі бібліятэчнай справы, былі пэўныя праблемы з абаронай дысертацыі. У нашым інстытуце, на жаль, тады не было Савета па абароне дысертацый па бібліятэказнаўству і бібліяграфазнаўству. Раскажыце, калі ласка, як вырашалася пытанне з абаронай дысертацыі.**

– Так, сапраўды, у нас былі пэўныя цяжкасці. У сувязі з тым, што па спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфазнаўства» ў Беларусі не было Савета па абароне дысертацый, мы праводзілі даследаванне не ў педагагічным, а ў гістарычным аспекце. Таму бібліятэчная справа даследавалася мною як сацыяльна-гістарычны працэс другой паловы 20 – 30-х гг. мінулага стагоддзя. Вельмі важна было паказаць бібліятэчнае будаўніцтва не толькі як неад'емны аспект культурнага будаўніцтва ў Беларусі, але і раскрыць яго сацыяльную ролю ў пад'ёме культуры, у прыватнасці, у ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці беларускага народа пасля рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, паказаць працэс уключэння працоўных у сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні. Разам з тым неабходна было паказаць не толькі агульнае, але і прыярытэтнае, прыватнае ў бібліятэчным будаўніцтве нашай краіны. Вам, Ніна Андрэеўна, гэта таксама вядома. Гэтыя праблемы перажылі не толькі я і Вы, але і шэраг нашых калег, хто абараняўся ў 70 – 80-я гг. Таму мы цяпер можам парадавацца за нашых маладых калег, якія маюць усе ўмовы для напісання дысертацыі ў аспіратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і абараніць яе ў родных сценах.

Трэба адзначыць, мы многа працавалі для вырашэння нашых праблем. Было складана, але цікава. Мы шчыра радаваліся поспехам. Стараліся не спыняцца, а пастаянна ісці наперад. З глыбокай удзячнасцю я ўспамінаю свайго навуковага кіраўніка, доктара гістарычных навук, прафесара В.М. Фаміна, які вучыў аспірантаў і суіскальнікаў многа працаваць, шукаць новыя шляхі ў вырашэнні праблемы, творчы падыход, умець увязваць бібліятэчную справу з сацыяльна-эканамічным развіццём грамадства, раскрываць ролю бібліятэкі і кнігі ў пад'ёме палітычнай, сацыяльнай і эканамічнай актыўнасці працоўных, у павышэнні вытворчасці працы.

**Вельмі прыемна, што навукова-даследчай дзейнасцю Вы займаецеся ўвесь час, нават цяпер, калі знаходзіцеся на заслужаным адпачынку. Нам вядома, што і зараз Вы супрацоўнічаеце з навукова-даследчым аддзелам бібліятэказнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Раскажыце, калі ласка, аб сваёй рабоце.**

– Сапраўды, я супрацоўнічаю на грамадскіх пачатках з навукова-даследчым аддзелам бібліятэказнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Разам з групай супрацоўнікаў аддзела я займаюся даследаваннем гісторыі станаўлення і развіцця бібліятэчнай справы ў Беларусі, з'яўлялася членам рэдакцыйнай калегіі трэцяга зборніка «Бібліятэчная справа на Беларусі: Дакументы і матэрыялы. 1959 – 1975», а таксама падрыхтавала гістарычную і археаграфічную часткі прадмовы да зборніка. Дакументы і матэрыялы, якія ўключаны ў зборнік, сведчаць аб тым, што гэты перыяд можна разглядаць як «залаты век развіцця бібліятэчнай справы ў рэспубліцы». У гэты час была створана адна з лепшых сістэм бібліятэчнага абслугоўвання карыстальнікаў інфармацыі.

У 1994 г. падрыхтаваны да друку чарговы, чацвёрты выпуск зборніка «Бібліятэчная справа на Беларусі: Дакументы і матэрыялы. 1976 – 1990». Гэта апошні выпуск, які ахоплівае савецкі перыяд. Я з'яўляюся членам рэдакцыйнай калегіі зборніка, а таксама напісала да яго прадмову. Дакументы зборніка сведчаць аб узрастанні грамадскай актыўнасці ў бібліятэчнай справе ў другой палове 70 – 80-х гадоў.

Работа па падрыхтоўцы 3-га і 4-га выпускаў выканана ў кароткія тэрміны. У гэтай справе ініцыятыва і арганізацыя работы належала намесніку дырэктара НББ Л.Г. Кірухінай і загадчыцы аддзела бібліятэказнаўства В.А. Сабалеўскай. Значны ўклад у стварэнне зборніка ўнесла метадыст-даследчык К.А. Навуменка, якая займалася выяўленнем і адборам дакументаў, іх археаграфічнай апрацоўкай, складаннем каментарыяў і г.д. Трэба адзначыць, што К.А. Навуменка – гэта спецыяліст з вялікай літары, якая жыве праблемамі бібліятэчнай справы, адказна і творча падыходзіць да вырашэння ўсіх праблем у працоўнай дзейнасці. Улічваючы, што Клаўдзія Аляксандраўна ўжо таксама на заслужаным адпачынку, хочацца пажадаць, каб у яе былі добрыя, такія ж таленавітыя і адданыя справе паслядоўнікі – маладыя спецыялісты.

**Ірма Пятроўна, работа над чарговым зборнікам завершана, але я ведаю, што Вы пастаянна займаецеся навукова-даследчай работай. Скажыце, калі ласка, над чым Вы працуеце цяпер?**

– Я прадаўжаю займацца гісторыяй бібліятэчнай справы ў Беларусі, падбіраю тэарэтычны і практычны матэрыял, вывучаю архівы. Думаецца, што гэта будуць нарысы па гісторыі бібліятэк і бібліятэчнай справы ў Беларусі. Справа ў тым, што ў мяне сабраны багаты матэрыял, які яшчэ не выкарыстаны ні ў дысертацыі, ні ў маіх публікацыях. Адчуваю, што ён будзе карысны студэнтам, выкладчыкам і супрацоўнікам бібліятэк. Планы вялікія, а што атрымаецца – пабачым.

**Ірма Пятроўна, вельмі прыемна, што Вы заходзіце да нас, цікавіцеся, чым жыве універсітэт, як працуюць выкладчыкі, аб чым мараць студэнты. Што б Вы хацелі ім пажадаць?**

– Перш за ўсё – любіць і паважаць прафесію бібліятэкара, спецыяліста ў галіне інфармацыі, ганарыцца ёю. Гэта галоўнае. Але для таго, каб любіць і паважаць прафесію, трэба добра яе ведаць. Вывучаць яе трэба са старажытных часоў, але не абасоблена, не ізалявана ад развіцця грамадства, а ўвязваючы з канкрэтнай гістарычнай эпохай, аналізуючы ўзаемадзеянне тэарэтычнай думкі і практычнай дзейнасці. На кожным этапе развіцця грамадства да кожнай з'явы трэба падыходзіць з гісторыка-філасофскага пункту гледжання, знаходзячы ў ім агульнае і асабістае. Мая асноўная думка: чалавек, спецыяліст павінен знаходзіцца ў пастаянным пошуку і папаўненні ведаў, узбагачэнні імі сябе. Па сутнасці, гэта служэнне сабе, сваёй любімай справе. На мой погляд, ад далучэння да гэтай важнай і патрэбнай справы Вы будзеце мець асабістае задавальненне, будзеце ганарыцца самі сабой і сваёй любімай справай.

**Ірма Пятроўна, шчыра дзякую Вам за цікавую размову. Мы зычым Вам добрага здароўя, плёну ў навуковай дзейнасці, рэалізацыі ўсіх планаў.**

*Падрыхтавала Н. Ляйко*